2 Савко, И. Э. Система упражнений по обучению грамматическим нормам русского литературного языка / И. Э. Савко // Русский язык и литература. – 2008. – № 6. – С. 22–31.

3 Мурина, Л. А. Русский язык : учеб. пособие для 5 класса учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения : в 2 ч. / Л. А. Мурина, Т. В. Игнатович, Ж. Ф. Жадейко. – Минск : «Национальный институт образования» Министерства образования Республики Беларусь, 2020. – Ч. 2. – 141 с.

4 Мурина, Л. А. Русский язык : учеб. пособие для 6 класса учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения / Л. А. Мурина, Т. В. Игнатович, Ж. Ф. Жадейко. – Минск : «Национальный институт образования» Министерства образования Республики Беларусь, 2020. – 239 с.

5 Мурина, Л. А. Русский язык : учеб. пособие для 8 класса учреждений общего среднего образования с белорусским и русским языками обучения / Л. А. Мурина, Т. В. Игнатович, Ж. Ф. Жадейко. – Минск : «Национальный институт образования» Министерства образования Республики Беларусь, 2018. – 243 с.

**УДК 37.091.33:811.161.3:821.161.3**

***В. А. Сцепчанка***

## МЕТАДЫ АКТЫЎНАГА НАВУЧАННЯ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ

*У артыкуле вызначаецца актуальнасць выкарыстання актыўных метадаў навучання на ўроках беларускай мовы і літаратуры; разглядаюцца прыёмы, віды і спосабы выкарыстання актыўных метадаў; прыводзяцца прыклады і тэхнікі, закліканыя зацікавіць навучэнцаў, дапамагчы засвоіць матэрыял рознай ступені складанасці, узбагаціць кругагляд і развіць творчае і лагічнае мысленне.*

Наш час характарызуецца актыўным развіццём свету вакол, тэхналагічнага боку, жыцця ўвогуле. Менавіта гэтыя фактары вымагаюць ад сістэмы адукацыі пастаяннага пераўтварэння, стварэння новых тэналогій навучання і развіцця. У такіх умовах сфарміраваліся метады актыўнага навучання, якія дапамагаюць засваенню вучэбнага матэрыялу, робячы працэс атрымання адукацыі цікавым.

Неабходна адзначыць, што “актывізацыя працэсу навучання – гэта ўдасканальванне метадаў і арганізацыйных формаў вучэбнай працы, якое забяспечвае актыўную тэарэтычную і практычную дзейнасць школьнікаў ва ўсіх звёнах навучальнага працэсу” [1].

Развіццё метадаў актыўнага навучання пачалося ў XX ст. і было абумоўленае:

1) навукова-тэарэтычнымі фактарамі, што складаліся з культуралагічнага, дзейнаснага, асобасна арыентаванага і кампетэнтнаснага падыходаў;

2) сацыяльнымі фактарамі, якія патрабавалі ад асобы мабільнасці, творчага падыходу да розных спраў, умення рашаць задачы рознай ступені складанасці і адказнасці пры выкананні розных сацыяльных роляў;

3) адукацыйнымі фактарамі, сутнасць якіх выяўлялася ў стварэнні і распрацоўцы новых метадаў навучання [2].

Актыўныя метады навучання дыферэнцуюцца на чатыры групы, сумяшчаючы групавыя і індывідуальныя заняткі з перавагай групавых:

1 дыскусійныя метады – заснаваныя на непасрэдных зносінах паміж вучнямі. Настаўнік пры гэтым актыўнага ўдзелу ў дыскусіі не прымае. Падчас дыскусіі адбываецца абмен ведамі і меркаваннямі, пры неабходнасці прымаецца групавое рашэнне;



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

2 гульнёвыя метады – выкарыстоўваюць элементы гульні, накіраваныя на атрыманне вучнямі новага вопыту;

3 рэйтынгавыя метады – актывізуюць дзейнасць вучняў у працэсе спаборніцтва;

4 трэнінгавыя метады накіраваныя на развіццё асобы вучня і яго паводзін [2].

Зараз актыўныя метады навучання могуць выкарыстоўвацца для развіцця розных навыкаў у вучняў, адпрацоўкі ўжо вывучанага матэрыялу, вывучэння вялікай колькасці матэрыялу за невялікі прамежак часу, праверкі і кантролю ведаў, актывізацыі даследчай дзейнасці вучняў.

Акрамя разнастайных метадаў навучання, існуюць розныя прыёмы. Трэба заўважыць, што “прыём – гэта сродак рэалізацыі выбранага метаду, канкрэтны варыянт вучэбнай дзейнасці настаўніка і вучня, якія рэалізуюць ідэі метаду на ўроку” [3, с. 36].

Вывучэнне беларускай мовы мае велізарнае значэнне. Такія школьныя прадметы, як беларуская мова і беларуская літаратура, дапамагаюць вучням не толькі даведацца шмат новай і цікавай інфармацыі, але і навучыцца свабодна выказваць свае думкі і разважаць на роднай мове. Для дасягнення гэтай мэты настаўнік мусіць прымяняць актыўныя метады навучання, бо гэта дапамагае зацікавіць навучэнцаў, зрабіць іх паўнапраўнымі ўдзельнікамі на занятках і ўтрымліваць увагу на працягу ўсяго ўрока.

Пры выкарыстанні актыўных метадаў навучання настаўнік мае магчымаць звяртацца да рознай літаратуры, выкарыстоўваць друкаваныя матэрыялы рознага характару, напрыклад, малюнкі, схемы, крыжаванкі, табліцы і не толькі. Варта адзначыць, што сучаныя школьныя падручнікі таксама змяшчаюць вялікую колькасць практыкаванняў, якія можна аднесці да актыўных метадаў навучання.

Адным з самых распаўсюджаных метадаў з’яўляецца напісанне сачыненняў. Існуе вялікая колькасць варыяцый дадзенага задання. Напрыклад, вучням у малодшай школе можа быць прапанавана напісаць сачыненне пра жыццё розных часцін мовы і адносіны паміж імі. Дадзены метад дапаможа лепш зразумець складаную і важную тэму, сістэматызаваць і палегчыць засваенне атрыманай ад настаўніка інфармацыі.

Заданне па напісанні сачынення мэтазгодна прапанаваць і вучням старэйшых класаў. Часцей дадзены метад выкарыстоўваецца пры вывучэнні розных стыляў тэксту. Напрыклад, вучні пішуць невялікія тэксты па пэўнай тэме, выкарыстоўваючы розныя стылі. Дадзены метад дапаможа назіральна зразумець адрозненні паміж функцыянальнымі стылямі тэксту і паспрыяе выпрацоўцы культуры беларускага маўлення.

Адным з асноўных разделаў пры вывучэнні мовы з’яўляецца фанетыка, бо разуменне фанетычных працэсаў садзейнічае выпрацоўцы арфаэпічных і арфаграфічных навыкаў. Пры вывучэнні фанетыкі вучні павінны засвоіць правілы пастаноўкі націску, супастаўленне гукаў і літар, вызначэнне розных асаблівасцей гукаў, зразумець сэнсаадрознівальную ролю гукаў і засвоіць нормы вымаўлення слоў у беларускай літаратурнай мове.

На ўроках па фанетыцы прымяняцца метад праблемнага выкладання, пры рэалізацыі якога вучні павінны самастойна зрабіць вывады аб структуры і асаблівасцях беларускай мовы, зыходзячы з інфармацыі, атрыманай з падручнікаў і ад настаўніка. Дадзены метад можа быць выкарыстаны пры вывучэнні правіл пастаноўкі націску ў словах і вызначэнні нормаў вымаўлення гэтых слоў.

Падчас прымянення метаду назірання і аналізу моўных з’яў вучні самастойна фармулююць правілы беларускага вымаўлення на грунце прапанаваных настаўнікам матэрыялаў. У гэтым выпадку можна выкарыстоўваць тэхнічныя сродкі, спрыяльныя актывізацыі не толькі зрокавага ўспрымання, але і ўспрыманню на слых, што дапаможа вучням засвоіць новы матэрыял.

Імітацыйна-супастаўляльны метад дапамагае карэкціроўцы маўлення вучня, спрыяе асэнсаванню і ўсведамленню структуры маўлення і рэалізуецца ў працэсе праслухоўвання вучнямі прыкладу ўзорнага вымаўлення і яго пераймання.



РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Метады актыўнага навучання таксама прымяняюцца пры вывучэнні іншых раздзелаў. На ўроку па словаўтварэнні вучні падбіраюць варыянты слоў з прапанаванымі марфемамі і ствараюць з іх крыжаванку.

Стварэнне крыжаванак адносіцца да эфектыўных прыёмаў па замацаванні матэрыялу. Вучні заўсёды з захапленнем выконваюць заданні такога тыпу. Падчас складання крыжаванкі вучань узгадвае патрэбныя тэрміны, шукае спосаб іх падачы і замацоўвае атрыманыя веды ў памяці, бо выкарыстоўваюцца розныя метады ўспрымання інфармацыі і яе запамінання.

Выніковым з'яўляецца вывучэнне новага раздзелу ў сувязі з іншымі. "Прынцып сувязі арфаграфіі з фанетыкай і арфаэпіяй вынікае з самой прыроды беларускай арфаграфіі, дзе большасць правіл правапісу галосных і часткова зычных заснавана на фанетычным прынцыпе арфаграфіі" [3, с. 199]. Пры выкладанні тэмы настаўнік можа звярнуцца да даследчага метаду актыўнага навучання і прапанаваць вучням знайсці сувязі паміж прапанаванымі раздзеламі і пацвердзіць кожную з іх прыкладамі.

Актыўны метад навучання пры вывучэнні граматыкі беларускай мовы дапамагае вучням сістэматызаваць атрыманыя ад настаўніка і з падручніка звесткі. Дарэчным будзе складанне схем і табліц, стварэнне творчых праектаў з выкарыстаннем мультымедыя, складанне квэстаў і крыжаванак з выкарыстаннем тэрміналогіі. Папулярным зараз метадам з'яўляецца стварэнне вучнямі тэстаў па тэме для сваіх аднакласнікаў. Гэты метад дапамагае вучням зразумець тэму больш глыбока і вылучыць для сябе самыя цяжкія і важныя часткі матэрыялу.

Гульнёвыя метады пры вывучэнні граматыкі таксама актуальныя. Напрыклад, настаўнік можа прапанаваць вучням гульню, дзе неабходна падзяліць прапанаваныя назоўнікі на адушаўлёныя / неадушаўлёныя або па родавых паказчыках: жаночы, мужчынскі і ніякі род.

Выкарыстанне актыўных метадаў навучання на ўроках беларускай мовы мэтазгодна і неабходна зараз, бо гэтыя метады вельмі эфектыўныя і цікавыя. Актыўныя метады навучання не толькі дапамагаюць настаўніку растлумачыць новы матэрыял, але і фарміруюць прыязныя адносіны вучням любоў да роднай мовы, развіваюць зацікаўленасць у яе вывучэнні. Развіццё сучасных камп'ютарных тэхналогій спрыяе гэтаму працэсу, таму што дае магчымасць успрымаць інфармацыю зрокава і на слых, а таксама ствараць розныя праекты.

Вывучэнне беларускай мовы немагчыма без выкарыстання актыўных метадаў навучання. У наш час актуальным з'яўляецца ўменне правільна і прыгожа фармуляваць і выказваць сваю думку так, каб іншыя правільна зразумелі, што чалавек мае на ўвазе. Актыўныя метады навучання развіваюць не толькі вучня, але і настаўніка. Улічваючы хуткасць, з якой развіваецца сучасны свет, настаўнік увесь час павінен абнаўляць свае веды, паялічваць іх, каб тая інфармацыя, якую атрымліваюць ад яго вучні, была карыснай і актуальнай.

## Літаратура


1 Кароткі тлумачальны слоўнік педагагічных тэрмінаў / А. І. Андарала, Г. Ф. Андарала. – Мінск : Ратапрынт БДПУ, 1995. – 49 с.

2 Активные методы обучения в деятельности педагога [Электронный ресурс]. – Режим доступа: https://znanio.ru/pub/775. – Дата доступа: 01.04.2023.

3 Методыка выкладання беларускай мовы: вучэбн. дапам. для студэнтаў філал. спецыяльнасцей устаноў, якія забяспечваюць атрыманне выш. адукацыі / М. Г. Яленскі [і інш.]; пад рэд. М. Г. Яленскага. – Мінск : Адукацыя і выхаванне, 2007. – 448 с.




РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ